5. Национальная стратегия устойчивого развития Республики Беларусь до 2035 года // Министерство экономики Республики Беларусь [сайт]. – Минск, 2003–2025. – URL: https://economy.gov.by/uploads/files/ObsugdaemNPA/NSUR-2035-1.pdf (дата обращения: 18.09.2025).
6. Нора, П. Проблематика мест памяти / П. Нора // Нора, П. Франция-память / П. Нора, М. Озуф, Ж. де Пюимеж, М. Винок. – СПб. : Изд-во СПб ун-та, 1999. – С. 17–50.
7. О геноциде белорусского народа : Закон Республики Беларусь, 5 января 2022 г., № 146-З // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь [сайт]. – Минск, 2003–2025. – URL: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12200146&p1=1&p5=0 (дата обращения: 18.09.2025).
8. О недопущении реабилитации нацизма : Закон Республики Беларусь, 14 мая 2021 г., № 103-З // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь [сайт]. – Минск, 2003–2025. – URL: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12100103&p1=1 (дата обращения: 18.09.2025).
9. Сборник информационно-методических материалов по охране историко-культурного наследия Республики Беларусь / сост. Г. Н. Ходор. – Гомель : КПУП «Колор» г. Мозырь, 2023. – 204 с.

**Нячаева Г.Р.**

# КОДЫ НАШАГА ТКАЦТВА. АРХЕАЛОГІЯ І ЭТНАГРАФІЯ. АЎТАРСКІ ПРАЕКТ ВЕТКАЎСКАГА МУЗЕЯ

*Ключавыя словы:* Веткаўскі музей, археалогія, этнаграфія, геаметрычны арнамент, код ткацтва, комплексныя доследы, семіотыка

Яшчэ ў пачатку стварэння нашага музея, у 1979 годзе, падчас экспедыцыйнай паездкі ў Неглюбку, мы ўбачылі на ручніках і народным строі адзення знакі з узростам каля 3–4 тысяч год [3, каталог ручнікоў, іл. 230–238; 11, іл. 60–83]. Нашы тканіны ў гэтых адносінах ніхто не даследаваў, але ў старажытных культурах спецыялісты адзначалі падобныя фігуры як раннеземляробчыя культавыя сімвалы [2], г.зн., адносілі іх да пачатку асваення земляробства і менавіта нашымі продкамі індаеўрапейцамі.

Другім імпульсам нашай цікавасці і актыўных пошукаў з’явілася археалагічнае багацце рэгіёна. Сімвалы, якія ляжаць у аснове арнаментальных кампазіцый нашых ткацкіх традыцый, належаць геаметрычнаму чыну. Яны ўзыходзяць да эпохі бронзы, як і знакамітая Стрэліца, буйны магільнік (95 пахаванняў), помнік індаеўрапейскай культуры, які даследавалі археолагі на тэрыторыі Веткаўскага раёна ў 1963 годзе [4; 5].

Зразумела, на кераміцы эпохі бронзы не ўбачыш прамых аналагаў ромба-крыжавага арнаменту “Неглюбкі”, што і зразумела. Аднак першыя ромбы і крыжы знайшліся на нашай тэрыторыі менавіта ў стрэліцкіх матэрыялах (3, мал. 93).

Гэтае адкрыццё ўласных традыцый як нашчадкаў старажытных сістэм сімвалаў сталася праграмай шматгадовых доследаў.

Знакі лічацца індаеўрапейскімі па паходжанні і ставяцца да геаметрычнага чыну, які склаўся, як мяркуюць, у II–I тыс. да н.э. У старажытнасці, верагодна, сістэма ромбаў звязвалася з вобразам зямлі, а розныя канфігурацыі ромба – з множнасцю “стадыяльных” вобразаў яе бостваў. Так, ромб з кручкамі “быў сімвалам Маці-Зямлі пладаноснай, знакам пладаноснага поля” [3, с. 22]. Варыянты касога крыжа, у тым ліку і з кручкамі на канцах, магчыма, нясуць “мужчынскі пачатак” у магіі ўрадлівасці. Нам вядомыя і беларускія “ромбы з кручкамі” і “крукі” на прасліцах ранняга жалезнага веку (3, мал. 94).

Экспедыцыя “Выратаванне старажытных знакаў”, распачатая 45 год таму, доўжыцца і сёння. Колькасць сабраных тканін з узорамі, пераважная частка з якіх маюць геаметрычныя фігуры, перавысіла 3600 экспанатаў. Сёння Веткаўскі музей – адзін з аўтарытэтных цэнтраў у паўнаце рэгіянальнага сабрання ткацтва, якое расце, і ў галіне доследаў семантыкі арнамента.

Нашай мэтаю на працягу многіх гадоў было не толькі высвятленне знешняга падабенства археалагічных і этнаграфічных арнаментаў, і не столькі пошук аналагаў тыпалагічнага паходжання, хоць і такія паралелі вельмі каштоўныя. У сумесных праектах этнографаў, культуролагаў і археолагаў мы імкнуліся высветліць генэтычна магчымыя сувязі паміж этнаграфічнымі традыцыямі і археалагічнымі культурамі.

Менавіта тымі, якія удзельнічалі ў працэсах культурнага этнагенэзу Верхняга Падняпроўя. Мы выбралі асноўным код геаметрычных сімвалаў і іх спалучэнняў.

Першыя спробы прасачыць фармальнае падабенства і семантычныя паралелі ў мясцовых археалагічных матэрыялах і этнаграфічных рэчах, тэкстах і рытуалах – былі заяўлены ўжо ў прынцыпах семіятычнага пабудавання нашай экспазіцыі ў 1987 годзе. Далейшы збор і сістэматызацыя ўзорных тканін дазволілі прадставіць ткацкія традыцыі рэгіёна у асобных вітрынах, у суправаджэнні абрадавых матэрыялаў. Праграмную ролю адыграла стварэнне якасна новага экспазіцыйнага комплекса ў 1994-м г.: у пяці ‘семантычных’ вітрынах ручнікі розных мясцовых традыцый былі зведзены па наяўнасці ў іх агульных асобных знакаў з верагоднай семантыкай архаічнага паходжання [19]. У выніку настойлівых доследаў у сістэматызацыі ткацкіх традыцый і ў маладаследаванай тэме народных назваў арнаментальных элементаў [13] удалося ажыццявіць шэраг экспедыцый ўздоўж старажытных шляхоў славянскіх родаў, у тым ліку, тысячакіламетровае падарожжа “Уздоўж Бесядзі” (1998). Атрымала магчымасць выхада 606-старонкавая калектыўная манаграфія “Арнаменты Падняпроўя” [3]. Яе зместам сталі гістарычны агляд этнагенэтычных працэсаў і абагульненне тысяч назіранняў за тэхнікамі і арнаментальнымі кампазіцыямі сотняў знойдзеных экспанатаў. Удасканалілася вызначэнне сапраўдных мясцовых лакальных традыцый ткацтва, прадстаўленых у этнагеаграфіі. У каталог ўвайшлі больш за 450 ручнікоў. Упершыню прадстаўлены “Алфавіт мясцовых назваў арнаментальных элементаў”, колькасць адзінак слоўніка, экспедыцыйна сабраных намі на працягу гадоў, перавысіла 600 назваў [3, с.73–163; 13]. Сістэмна прыведзены семіятычныя доследы кампазіцый арнамента як мадэляў культурнай прасторы, што прыцягвала нашу ўвагу доўгі час [12; 18; 3, с. 163–334]. Картаграфіраваны і лакалізаваны з’явы мясцовых абрадаў “Свячы”, “Стралы”, выклікання дажджу ды іншыя дадзеныя этнагеаграфіі, фальклору і міфалогіі [3, мал. 82–91]. Урэшце, праведзена супастаўленне ‘тэкстаў’ арнаменту і фальклорных тэкстаў замоў па асобных традыцыях з выяўленнем падабенства іх сінтаксіса, што вызвала ўвагу і маскоўскіх вучоных [3, с. 339–393; 10]. Пры тым у дадзенай манаграфіі матэрыялы сталіся базаю разгляду выключна ручнікоў. Агляд і сістэматызацыя калекцыі знакаў і іх мясцовых назваў на адзенні і абрусах склалі аснову працягу доследаў [1; 21]. Геаметрычныя сімвалы яўна дэманстравалі рэшткі адзінай сістэмы для ўсяго комплекса рытуальных тканін, ад адзення чалавека ў яго жыцці і смерці, да адзення дома і адзення Покуці ў іх каляндарных пераменах і ўзаемасувязі. Назіралася ‘прывязка’ асобных сімвалаў да асобных ‘ зон’ у кроі і шыцці рубах, у іх пола-узроставых пераменах [21; 22; 24; 27]. Адзіныя чыны геаметрычных знакаў фіксаваліся і для галаўных платкоў-намітак, і ў вырабе абрадавых абрусаў [21; 22].

Сур’ёзнасць нашых намераў па семантычнаму даследванню багацейшай спадчыны ‘у ткацкім кодзе’ ажыццяўляецца у шэрагу выстаў і публікацый, з прыцягненнем збору мясцовай народнай тэрміналогіі і наогул тэрмінаў ткацтва. Вынікі назіранняў адлюстравалі унікальную сістэму з архаічнымі каранямі, што паглыблялася ў сістэмы семантычных апазіцый старажытнай славянскай культуры [13; 15; 16].

Сумесныя экспедыцыі і даследванні мясцовых матэрыялаў этнаграфіі і археалогіі паказалі перспектыўнасць падыходу. Так, вывучэнне ‘тэзауруса’ рамбічных фігур у арнаменце лакальных традыцый, фіксацыя іх назваў і ўдзелу ў ‘сінтаксісе’ кампазіцый былі спачатку семіятычнай задачай у частцы этнаграфічных набыткаў [23]. Аднак доследы перайшлі на другі ўзровень з прыцягненнем археалагічных дадзеных па рамбічных фігурах на археалагічных артэфактах, што мы распачалі супастаўляць яшчэ ў першай экспазіцыі 1987 г., а затым і ў галоўнай нашай манаграфіі [3, мал. 93–101].

На новых этапах нашай працы мы ўгледзеліся ў канкрэтныя прыклады з канкрэтнымі знакамі, у паслядоўнасці нанясення якіх на археалагічныя артэфакты мы

бачылі аналагі пабудавання кампазіцыйных ‘сінтагм’ арнаменту на ручніках. Такія знакі паходзілі з Падзісення, блізкага нам геаграфічна, гістарычна і дагістарычна. Геаметрычныя знакі на познезарубінецкай кераміцы I–II ст. н.э. з раскопак Ф.М. Заверняева, па меркаванню аўтара археалагічных даследванняў, з’яўляліся сімваламі і “мелі дачыненне да ідэалогіі” [9]. Параўнанне з падобнымі знакамі ды іх паслядоўнасцямі на ручніках суседніх традыцый дало надзейныя супадзенні ў кантэксце культурнага этнагенэзу [14]. Акрамя почапскіх і сінькоўскіх матэрыялаў разглядзелі беларускія “ромбы з кручкамі” і “касыя крыжы з крукамі” на прасліцах ранняга жалезнага веку, сінхронных верхнедзяснінскім знаходкам (3, мал. 94; 14, мал. 1). Размяшчэнне даследаваных груп знакаў на археалагічных артэфактах, як мы заўважылі, не носіць арнаментальнага характару, нагадваючы, хутчэй, магічнае нанясенне сімвалаў. Можна было адзначыць не толькі іх занальнае размяшчэнне, маючае ‘касмалагічную прывязку’ у мікракосме самога прадмета, што ў культурным кодзе керамікі надзвычай інфарматыўна. Было выяўлена і асіметрычнае групаванне знакаў, якое нагадвае прэдыкатыўныя адзінкі, запісы ‘выказванняў’.

Праз пэўны час мы падоўжылі археалагічна-этнаграфічныя назіранні. Цяпер аб’ектамі стала кераміка больш ранняга часу, эпохі позняй бронзы, бандарыхінскай культуры з Северскага Данца – і зноў нашы этнаграфічныя знаходкі. Носьбіты бандарыхінскай культуры паўдзельнічалі ў нашых этнакультурных працэсах [7]. Для VIII–IX ст. да н.э. апазіцыі знакаў зноў былі прадстаўленыя ў сінтаксічных злучэннях. Мы прыцягнулі да параўнання і назіранняў матэрыялы, апублікаваныя Ю.В. Буйновым [6]. Сярод удзельнікаў ‘сінтагм сімвалаў’ галоўнымі, зноў-такі, з’яўляліся ромбы і касыя крыжы. Ромбы знайшліся як ‘зерневыя’, якія былі ў Стрэліцы за некалькі стагоддзяў да таго, так і косаштрыхаваныя, якія будуць актуальныя для почапскай керамікі праз некалькі стагоддзяў. Апошнія – ў парах з раскрэсленымі ‘нівамі’ (7, мал. 8 – 11). Гарызантальныя спалучэнні сцвярджалі тыя ж пары, што і пазней у артэфактах рубяжа нашай эры. Раскрыжаваныя культурныя знакі амаль сучаснага ўзору, якія бачым ў этнаграфічных тканінах (мал. Негл. паласа).

Сярод прыкладаў у нашых археолага-этнаграфічных артыкулах [14] была разгледжана адна са знакавых кампазіцый з Дзясны – вертыкальны ланцуг розных ромбаў на вертыкальным борціку міскі (3, мал. 8-1; 7, мал 4; 14, мал. 3). У ланцугу чаргаваліся ромбы без выступаў – і ромбы з гарызантальнымі крукамі (як памятаем, апошнія – варыянт “раннеземляробчага культавага сімвалу – ромба з кручкамі”). Знайшлі аналагі кампазіцыі ў тканых ручніках. Адным з найбольш выразных аказаўся ручнік з в. Некрасава Веткаўскага р-на (прав. р. Беседзі) (3, каталог, іл. 28). Мы вылучылі вертыкальны тып арнаментальнай кампазіцыі на ручніках як адзін з асноўных [18]. Першапачаткова выяўлены ў веткаўскім раёне, тып гэты дэманструе архаічнае паходжанне і абразуе глосы распаўсюджання па правых берагах рэк, уздымаючысь да полацкіх, віцебскіх ды іншых традыцый. Тут мы адзначым толькі, што ў нашым мікрарэгіёне такія кампазіцыі ‘прывязаны’ да правых берагоў Сожа, Беседзі. Рад населеных пунктаў з дадзенай традыцыяй, экспедыцыйна вылучанай, адзначаны ў гістарычных крыніцах з XVI ст. Такім чынам, з нашай кропкі адліку ўдалося паглыбіцца ў верагоднасці існавання вертыкальнага тыпу ручнікоў на паўтысячы год.

Сёння мы маем магчымасці вяртацца да разгледжаных раней матэрыялаў у сувязі з новымі дадзенымі. Яны з’яўляюцца ў выніку доследаў і апублікаваных матырыялаў, а таксама, што найбольш уражвае, у выніку новых археалагічных і этнаграфічных знаходак, выяўленых падчас актыўнай даследніцкай дзейнасці музея.

Так, параўноўваючы сінькоўскую міску і ручнік вертыкальнага тыпу мы ўбачылі, што ў абодвух выпадках ромбы з крукамі маюць разкрыжаваную (клятчастую) сярэдзіну, што з’яўляецца даўней піктаграмай ўзоранага поля, нівы (у даўніну аралі

крыж-накрыж). Малыя ж ромбы культурнай адзнакі не маюць. Але тэма ‘няўзоранага поля’, ‘цаліны’, ‘стыхійнага пачатку’ вырашаецца па-рознаму. На зарубінецкім артэфакце ромбы коса заштрыхаваныя. На ручнику – канцэнтрычныя. Тэма канцэнтрычна пабудаваных ромбаў, што нагадвае гадавыя колы дрэва, намі даследуецца даўно. Банк дадзеных грунтоўны і паказвае магчымыя вобразныя сувязі паміж некранутай зямлёй-цалінай – і дзявоцтвам. У розных рамбічных знаках могуць быць адлюстраваны ініцыяцыйныя сімвалы.

Істотная розніца в структуры малых ромбаў ручніка і археалагічнай знаходкі дазваляе зразумець значнасць касой штрыхоўкі для сістэмы Сінькова. Мабыць, яна магла пазначаць якраз тую “стыхійную іпастась” зямлі, якая часта і ў этнаграфічнай традыцыі, у прыватнасці, на ручніках, уяўляецца нерасчлененым (цёмным, глухім) ромбам. Гэтая неапрацаванасць зямлі і патаемнасць яе ‘неабуджанага стану’ у народных традыцыях суправаджаецца адпаведнымі варыянтамі мясцовых назваў глухога ромба: *глухоўка, глушка, глухая, глухая-сляпая* [3, с. 73–163]. З іншага боку, археалагічны артэфакт, міска з Сінькова, з яе косаштрыхаванымі ромбамі, растлумачвае этнаграфічны звычай, запісаны намі: абвязваць аборкі лапцей вакол нагі дзяўчатам – па касой, замужнім – крыжападобна. Прызнак касога і няпоўнага – адзін з асноўных архетыпаў вобразнай сістэмы традыцыйнай культуры. Аднак канцэнтрычных ромбаў на археалагічных артэфактах мясцовага паходжання мы на той час не ведалі.

У выкананні геаметрычных знакаў прамыя лініі перавагаюць. Яны праходзяць праз тысячагоддзі і маюць надзейную аснову ў формах самога земляробчага працэсу. Іншы імпульс – схільнасць да касых рысаў. Такія – ромбы, касыя крыжы ды іх мадыфікацыі. Аморфная гліна, што прымае на сябе любыя ‘інфармацыйныя сістэмы знакаў і тэхнік’, такім чынам, верагодна, перадае характар выконвання знакаў на нейкім іншым цвёрдым носьбіце. Стыль знаёмы нам па тканінах. Дзівіць ўстойлівасць формаў геаметрычных знакаў.

Як мы працуем з дадзенымі? Прывядзем адзін прыклад, непазбежна скарочаны.

На днях да нас трапіў падарунак – выпадкова знойдзенае пасля летней навальніцы, вымытае з-пад адкоса прасліца, грузік для верацяна. Яно з гліны. Упершыню за ўсе гады вывучэння знакаў у гэтым сезоне мы атрымалі артэфакт з эпохі бронзы, важны ў цэлым шэрагу значэнняў.

Па-першае, гэта новая сведка і ‘маркёр’ ткацкай тэмы.

Па-другое, арнаментаваны геаметрычным арнаментам прадмет паходзіць з трохтысячагадовай даўніны і з нашых мясцін.

Па-трэцяе, аздабленне альбо магічнае выкананне знакаў на прасліцы – трохтысячагадовае пацверджанне ўстойлівай традыцыі. Раней мы зразумелі, што менавіта гліняныя прасліцы застаюцца апошнім разрадам арнаментаваных керамічных аб’ектаў, бо яны бліжэй за ўсё датыкаюцца да новага (?) носьбіта магічнай інфармацыі – ніткі. Яе роля сходная з лініяй (лінія, этымалагічна, і азначае ільняную нітку). Нітка – выканаўца знакаў у самім ткацтве. Арнаментаваныя прасліцы – амаль апошнія носьбіты знакаў у зарубінецкай культуры, добра вядомай нам. Аднак прасліца з эпохі бронзы сцвярджае свой удзел ў інфармацыйным полі раней, больш за тысячагодзе да н.э. Такім чынам, атрымліваюць новы сэнс і радкі з паэмы Авідзія, сучасніка зарубінецкай культуры на рубяжы н.э. Вершы прысвячаліся ведзьме таго часу і змяшчалі яе характарыстыку. Вось яны:

Магию знает она, заклинанья восточные знает…
Ведает свойства и трав,
и *льна на стволе веретённом*…)
[Овидий, 1983, с. 35].

Па-чацвёртае, ў знаках пацвердзілася наяўнасць і супастаўленне ‘стыхійных’ і ‘культурных’ сімвалаў зямлі-жанчыны.

Па-пятае, урэшце з’явілася рэч-тэкст, у якім фармальна выражаная апазіцыя канцэнтрычнага і раскрыжаванага тыпу штрыхоўкі геаметрычных фігур. Менавіта тая, якую ўжываюць арнаменты нашых тканін. Гэта першая на сёння і амаль рэвалюцыйная для нас інфармацыя. Апазіцыя стыхійнага/культурнага у дачыненні да ромбаў (і трохкутнікаў як варыянту жаночага знака) выразілася ў чатырох паўромбах (трохкутніках), два з якіх маюць канцэнтрычную штрыхоўку, два – раскрэсленыя ‘у клетачку’.

Шостым пунктам атрымання новай інфармацыі з’яўляецца прымяненне формы ўласна трохкутнікаў. Хаця ж гэтая форма найбольш папулярная ў кераміцы эпохі бронзы і раней, неаліту, мы можам вылучыць асаблівасць прымянення трохкутнікаў на прасліцы. Яны рытмічна размешчаны па верхняй частцы біканічнага прасліца, кранаючыся яго гарызантальнага рабра, нават абапіраючыся на яго. Г.зн., фігуры бачныя для ткаллі зверху, як былі б бачныя ромбы, калі б яны сканчаліся на ніжнім, ‘нябачным’ баку прасліца, за яго рабром. Акрамя таго, што эканомнасць сродкаў выразнасці характэрны для старых культур і наогул для этнаграфіі, можна заўважыць магчымае супрацьстаўленне верхняй паловы прасліца – і нябачнай ніжняй. Знакі нанесеныя на бачную верхнюю паверхню, робяць яе тэкстам культуры. Ніжняя частка, не кранутая знакамі, сама робіцца выразнікам стыхійнасці і хтанічнасці. Канічная форма верха і нізу лаканічна выражае найважнейшую ідэю ромба ў “3-D”.

Па-сёмае, вядома, якімі важнымі для лёсу дзяўчынкі-дзяўчыны-жанчыны з’яўляюцца працэс прадзення і ткання, а таксама яго прылады. І сёння яны поўныя сімвалічнага, магічнага, міфічнага зместу. Для пряллі з вераценцам трохтысячагадовай даўніны можна зразумець сувязь кампазіцыі знакаў і самога прасліца з уласным лёсам той дзяўчыны. Абстрактныя для нас чаргаванні ‘дзявочых’ і ‘жаноцкіх’ (альбо ‘стыхійных’ і ‘культурных’) знакаў былі для яе праграмай жыцця. Мы не ведаем, хто рабіў прасліца. Калі яна сама, то так адзначылася яе мара. Калі бацька альбо жаніх, што найчасцей мы бачым ў этнаграфічнай традыцыі, то знакі – пажаданне ўдалага шлюбу.

Па-восьмае, як працяг папярэдняга разважання, патрэбна адзначыць памежную ролю праллі, знаходжанне яе паміж светамі, дакрананне да хтанічнага і нават міфічнага. У такіх умовах пагроза для самой творцы новага ўзрастае, і павышаецца роля і неабходнасць рэчы-абярэга. У бытавым сэнсе, для дзяўчыны, уключанай у працэс стварэння тканіны. У міфалагічнай прасторы робіцца верагодным з’яўленне духа прадзення. У апошнія вякі хрысціянская Параскева, раней праславянская Мокаш… Яны дасюль жывуць у беларускіх былічках, прыкметах, загадках, забаронах і прадпісаннях – у календары і ў жыцці. І тады ‘наш тэкст’ на прасліцы – тэкст для боства прадзення.

1. Алфавіты арнаментальных элементаў на ткацкіх вырабах. Мясцовыя назвы Неглюбскай традыцыі. Кашуля, платок, абрус // Навуковыя запіскі Веткаўскага музея народнай творчасці. – Гомель, 2004.

2. Амброз, А. К. Раннеземледельческий культовый символ (“ромб с крючками”) / А. К. Амброз // Советская археология. – 1965. – № 3. – С. 11–22.

3. Арнаменты Падняпроўя / аўт. тэкстаў Г.Р. Нячаева і інш.) – Мінск : Бел. навука, 2004. – 606 с.

4. Артёменко, И. И. Могильник среднеднепровской культуры в урочище Стрелица / И. И. Артёменко // Энеолит и бронзовый век Украины. – Киев, 1976. – С. 69–96.

5. Артёменко, И. И. Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы / И. И. Артёменко. – М. : Наука, 1967. – 138 с.

6. Буйнов, Ю. В. К вопросу об исторических судьбах племён бондарихинской культуры / Ю. В. Буйнов // Российская археология. – 2006. – № 2. – С. 39–50.

7. Дробушевский, А. И. Ромбы "целинные" и "засеянные". Геометрический чин знаков в археологических и этнографических памятниках / А. И. Дробушевский, Г. Г. Нечаева // Деснинские древности. Материалы межгосударственной научной конференции, посвященной памяти Ф.М. Заверняева. – Вып. 5. – Брянск, 2008. – С. 24–33.

8. Дробушевский, А. И. «Иранский компонент» у северян и особенности этнографических тканей междуречья Сожа – Ипути / А. И. Дробушевский, Г. Г. Нечаева // Российско-Белорусско-Украинское пограничье: проблемы формирования единого социокультурного пространства – история и перспективы : материалы международной научно-практической конференции. – Брянск : ООО «Ладомир», 2008. – С. 57–62.

9. Заверняев, Ф. М. Почепское селище // Новые данные о зарубинецкой культуре в Поднепровье / Ф. М. Заверняев // МИА. – М., 1969. – № 160. – С. 88–118.

10. Кляус, В. Л. Заговоры и рушники Ветковского района: опыт сопоставления и выявления фольклорной «модели мира» / В. Л. Кляус, Г. И. Лопатин, Г. Г. Нечаева // Заговорный текст. Генезис и структура. – М., 2005. – С. 452–466.
11. Навуковыя запіскі Веткаўскага музея народнай творчасці. – Гомель : Выд-ва УА "ГДУ імя Ф. Скарыны", 2004. – 303 с.
12. Нечаева, Г. Г. Симметрия пространства и времени в рушнике. Семантика формы рушника / Г. Г. Нечаева // Матэрыялы абласной навукова-практычнай канферэнцыі "Ручнік як увасабленне традыцыйнай культуры беларусаў" (Віцебск, 29–31 кастрычніка 1996 г.). – Віцебск, 1998. – С. 20–23.
13. Нечаева, Г. Г. Региональная терминология орнамента / Г. Г. Нечаева // Проблемы восточно-славянской этнолингвистики. Материалы первой этнолингвистической международной конференции, посв. памяти ученого, филолога-слависта, академика РАН Никиты Толстого (Минск, 25–27 апреля 2003 г.). – Минск, 2003.
14. Нечаева, Г. Г. Судьба одного знака. Археология Почепа и современная этнография / Г. Г. Нечаева // Сб. научных статей «Деснинские древности». – Брянск, 2006. – С. 362–372.
15. Нечаева, Г. Г. Тексты текстиля и мифологические мотивы / Г. Г. Нечаева // Славянская мифология и этнолингвистика : сборник научных статей / редкол.: В. И. Коваль (отв. ред.) [и др.]; М-во образования Респ. Беларусь, Гом. гос. ун-т. Ф. Скорины. – Гомель: ГГУ им. Ф. Скорины, 2015. – С. 197–202.
16. Нечаева, Г. Г. *Сляпыя вядзьмедзі* и *зоркія веряб'і*: архаика в терминологии орнамента деревни Неглюбки / Г. Г. Нечаева // Славянская фразеология и паремиология. Национальное и интернациональное. Стабильное и изменчивое. К 70-летию со дня рождения профессора В. И. Коваля : сборник научных статей / редкол.: Е. В. Нечипорчик (отв. ред.) [и др.]. – Гомель : ГГУ им. Ф. Скорины, 2021. – С. 216–222.
17. Нячаева, Г. Р. Праявы стыхіі ды хтанічнай энергіі ва ўзорных тканінах / Г. Р. Нячаева // Этнаграфія Падняпроўя. Матэрыялы навуковай канферэнцыі. – Магілёў, 1999.
18. Нячаева, Г. Р. Арнаментальныя кампазіцыі канцоў ручнікоў як мадэлі культурнай прасторы / Г. Р. Нячаева // Ткацтва. Зборнік матэрыялаў па беларускаму народнаму ткацтву. – Мінск, 1999.
19. Нячаева, Г. Р. "Агонь – сонца – зямля – чалавек – ураджай" (з гісторыі "семантычных" экспазіцый) / Г. Р. Нячаева // Музейныя сшыткі. Веткаўскі музей народнай творчасці. Навукова-метадычны зборнік. – Мінск, 2001.
20. Нячаева, Г. Г. Архаічныя імпульсы узорнага ткацтва на памежжы Беларусі-Украіны-Расіі / Г. Г. Нячаева, І. В. Штанкіна // Традыцыі матэрыяльнай і духоўнай культуры Усходняга Палесся. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гомель, 20–21мая 2004 г.). – Частка І. – Гомель, 2004.
21. Нячаева, Г. Р. Арнамент: прастора рэчы і мова традыцыі. Кашулі, галаўныя жаночыя "платкі" і абрусы / Г. Р. Нячаева // Навуковыя запіскі Веткаўскага музея народнай творчасці. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2004. –С. 111–139.
22. Новікава, Л. А. Частата ўжывання арнаментальных элементаў на ткацкіх вырабах. Статыстычны звод / Л. А. Новікава, Г. Р. Нячаева // Навуковыя запіскі Веткаўскага музея народнай творчасці. – Гомель, 2004.
23. Нячаева, Г. Р. Арнаментальны знак "ромб" і яго асацыятыўныя мясцовыя назвы / Г. Р. Нячаева // VIII Навуковыя чытанні, прысвечаныя С. Некрашэвічу. Зборнік навуковых артыкулаў у 2-х частках. – Ч. 2. – Гомель, 2007. – С. 229–234.
24. Нячаева, Г.Р. Вопыт вывучэння арнаменту на аддзенні ў сувязі з мясцовай традыцыйнай тэрміналогіяй / Г. Р. Нячаева // Сб. Нацыянальны касцюм у сучаснай сацыякультурнай прасторы. – Мінск, 2008.
25. Нячаева, Г. Сімволіка геаметрычнага арнаменту ткацкіх традыцый паўднёвага усходу Беларусі / Г. Нячаева // Беларускі гістарычны часопіс. – 2024. – № 7. – С. 60–65.
26. Овидий. Любовные элегии. Метаморфозы. Скорбные элегии. – М. : Худ. Литерат., 1983. – 512 с.
27. Смирнова, И. Ю. Возрастная дифференциация женской одежды неглюбского строя / И. Ю. Смирнова // Навуковыя запіскі Веткаўскага музея народнай творчасці. – Гомель : ГДУ імя Ф. Скарыны, 2004. – С. 107–111.

**Отнюкова М.С., Черевичко Т.В.**

## МУЗЕЙНЫЙ ТУРИЗМ КАК СПОСОБ СОХРАНЕНИЯ И ПРОДВИЖЕНИЯ КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ РЕГИОНА

*Ключевые слова:* инновации, музей, культурное наследие, туризм, экскурсии

Современное общество демонстрирует растущий интерес к уникальным формам туризма, способным объединить культурные, образовательные и развлекательные аспекты. В этом контексте музейный туризм занимает особое место, позволяя путешественникам погружаться в атмосферу эпохи, открывать новые грани культурного наследия и знакомиться с жизнью выдающихся личностей и исторических событий посредством музейной экспозиции, и территории, к которой они примыкают.

В Саратовской области насчитывается 26 государственных и муниципальных музеев [4]. Среди уникальных культурных объектов стоит выделить Саратовский государственный художественный музей имени А.Н. Радищева и музей-усадьбу Н.Г. Чернышевского. Для исследования спроса на музейный туризм был проведен опрос. В опросе участвовали 143 человека, из них женщины – 72 человека, мужчины – 71 человек, все опрошенные в возрасте от 18 до 60 лет. Респондентам предлагалось ответить заинтересованы ли они в познании истории и культуры города Саратова, знакомы ли они с музеями и культурным наследием города.

По результатам опроса выяснилось, что большая часть респондентов (85%) интересуются музейным туризмом в Саратовской области. Также 79% респондентов отме-